Министерство связи и информатизации Республики Беларусь
Научно-инженерное республиканское унитарное предприятие
"Институт прикладных программных систем"
(НИРУП "ИППС")

**ГОСУДАРСТВЕННЫЙ РЕГИСТР ИНФОРМАЦИОННЫХ РЕСУРСОВ**

# РЕГИСТРАЦИОННОЕ СВИДЕТЕЛЬСТВО

№ 1141920554 от 28.11.2019 г.

о включении в Государственный регистр информационного ресурса

**Учебно-методический комплекс по учебной дисциплине «Источниковедение Беларуси» для специальностей: 1-02 01 01 История и обществоведческие дисциплины; 1-02 01 02 История и мировая художественная культура; 1-02 01 03 История и экскурсионно-краеведческая работа**

Владелец информационного ресурса

**Учреждение образования "Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка"**

Автор информационного ресурса

**Калечиц Инна Леонидовна**

Директор И.А. Михайловский

М.П.

Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

Гістарычны факультэт

Кафедра ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі

Рэг. № УМ(К)ГФ-2-19/2019

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
_______________А.А. Корзюк
«27» сакавіка 2019 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
_______________А.В. Касовіч
«27» сакавіка 2019 г.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

**Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі**

для спецыяльнасцяў
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

Складальнік: кандыдат гістарычных навук, дацэнт Калечыц І.Л.

Разгледжана і зацверджана на паседжанні Савета БДПУ

“28” ____03___ 2019 г., пратакол № _7_.

2019 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

Гістарычны факультэт

Кафедра ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі

Рэг. № ________

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
_______________А.А. Корзюк
«27» сакавіка 2019 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
_____________А.В. Касовіч
«27» сакавіка 2019 г.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ**

**Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі**

для спецыяльнасцяў
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

Складальнік: кандыдат гістарычных навук, дацэнт Калечыц І.Л.

Разгледжана і зацверджана на паседжанні Савета БДПУ

“28” ____03___ 2019 г., пратакол № _7_.

2019 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ЗМЕСТ**

1. Тлумачальная запіска
2. Тэарэтычны раздзел
2.1. Тэмы лекцый па вучэбнай дысцыпліне “Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі”
3. Практычны раздзел
3.1. Планы практычных заняткаў па вучэбнай дысцыпліне “Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі”
4. Радзел кантролю ведаў
4.1. Пытанні да заліку па вучэбнай дысцыпліне “Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі”
5. Дапаможны радздел
5.1. Вучэбная праграма па дысцыпліне (з вучэбна-метадычнай картай дысцыпліны)
6. Інфармацыйна-метадычная частка
6.1. Літаратура

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі – гэта навуковая дысцыпліна, якая распрацоўвае теорыю і методыку даследавання крыніц, даследуе гістарычныя крыніцы па гісторыі Беларусі і тую інфармацыю, якую яны ўтрымліваюць.

Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі мае сувязі з такімі дысцыплінамі як “Гісторыя Беларусі”, “Краязнаўства і этналогія Беларусі”, “Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны”. Такім чынам, вялікае значэнне ў вывучэнні крыніцазнаўства гісторыі Беларусі мае міждысцыплінарны падыход.

Мэта дысцыпліны “Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі” – даць студэнтам веды па тэорыі і методыцы крыніцазнаўства, інфармацыю аб крыніцах, звязаных з мінулым Беларусі, асноўных захавальніках і публікацыях крыніц па гісторыі Беларусі. Традыцыйна навучальнае крыніцазнаўства разглядае методыку даследавання асобных відаў пісьмовых крыніц. Для рэалізацыі вызначанай мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных задач:

- засваенне тэарэтычных ведаў у галіне крыніцазнаўства;
- аваладанне асновамі методыкі даследавання гістарычных крыніц;
- знаёмства з асноўнымі відамі пісьмовых крыніц па гісторыі Беларусі, іх захавальнікамі і публікацыямі.

Вучэбна-метадычны комплекс па крыніцазнаўству гісторыі Беларусі – гэта адкрытая сістэма дыдактычных сродкаў для эфектыўнага кіравання і самакіравання, стымулявання і падтрымкі, кантроля розных відаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў 1 і 2 курса. У працэсе выкладання крыніцазнаўства гісторыі Беларусі студэнты вывучаюць пытанні тэорыі і метадалогіі крыніцазнаўства, знаёмяцца з асноўнымі метадамі даследавання гістарычных крыніц, а таксама з асобнымі відамі і комплексамі гістарычных крыніц, асноўнымі іх захавальнікамі і публікацыямі.

На практычных занятках вывучаюцца найбольш складаныя пытанні тэорыі і метадалогіі крыніцазнаўства, разглядаецца інфармацыя аб асноўных відах гістарычных крыніц па гісторыі Беларусі. Засваенне ведаў па дысцыпліне правяраецца з дапамогай франтальнага і індывідуальнага апытання, кантрольных работ. Кіруемая самастойная работа ўключае ў сябе напісанне рэферата і стварэння прэзентацыі. Агульны кантроль засваення дысцыпліны ажыццяўляецца у час заліка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### Канспекты лекцый:

**Лекцыя 1. Асновы тэорыі і методыкі крыніцазнаўства**

Ключавыя паняцці: прадмет крыніцазнаўства, задачы крыніцазнаўства, тэорыя крыніцазнаўства, методыка крыніцазнаўства

План

1.Прадмет і задачы крыніцазнаўства гісторыі Беларусі.

2.Тэорыя і методыка крыніцазнаўства

3. Распрацоўка теарэтычных пытанняў крыніцазнаўства і методыкі даследавання гістарычных крыніц у канцы XIX – XX стагоддзі.

Канспект лекцыі:

1.Прадмет і задачы крыніцазнаўства гісторыі Беларусі.

Крыніцазнаўства – гэта гістарычная навука, якая распрацоўвае тэорыю і методыку вывучэння гістарычных крыніц, вядзе практычную работу па выяўленні і вывучэнні крыніц. Прадметам вывучэння крыніцазнаўства з'яўляюцца ўсе гістарычныя крыніцы ва ўсёй сукупнасці заключанай у іх інфармацыі. Асноўныя задачы крыніцазнаўства – распрацоўка тэарэтычных аспектаў вывучэння гістарычных крыніц, распрацоўка метадычных прыёмаў вывучэння гістарычных крыніц і выкарыстанне ведаў у галіне тэорыі і методыкі ў працэсе практычнага вывучэння гістарычных крыніц.

2. Тэорыя і методыка крыніцазнаўства

Тэорыя крыніцазнаўства распрацоўвае пытанне прыроды крыніцы, яе ўласцівасцяў, адмежавання крыніцазнаўства ад сумежных гістарычных дысцыплін, выкарыстання сістэматызацыі і класіфікацыі крыніц, метады эўрыстыкі (пошуку) крыніц. Тэарэтычнае крыніцазнаўства распрацоўвае агульныя метады вывучэння і даследавання гістарычных крыніц. Гэтыя метады адаптуюцца і канкрэтызуюцца ў дачыненні да вывучэння асобных груп крыніц, або пэўных іх характарыстык. Калі для тэарэтычнага крыніцазнаўства метад – гэта і прадмет даследавання, то для прыкладнога – гэта любы інструмент вывучэння.

3. Распрацоўка теарэтычных пытанняў крыніцазнаўства і методыкі даследавання гістарычных крыніц у канцы XIX – XX стагоддзі.

Распрацоўка тэарэтычных пытанняў крыніцазнаўства і методыкі даследавання крыніц у канцы XIX –пачатку XX ст. Э.Бернгаймам, Ш.-В. Ланглуа і Ш.Сеньобасам. Аб'ект, прадмет і задачы крыніцазнаўства. Погляды на пазнанне мінулага В.Дыльтэя, В.Віндэльбанда, Г.Рыкерта. Тэорыя каштоўнасцей і гістарычныя крыніцы. Уклад А.С. Лаппо-Данілеўскага ў распрацоўку крыніцазнаўчых пытанняў. Развіццё крыніцазнаўства ў навейшы час. Погляды на крыніцазнаўчую працу гісторыка М.Блока, Л.Феўра і інш. Распрацоўка тэорыі і методыкі крыніцазнаўства савецкімі гісторыкамі. Распрацоўка крыніцазнаўства гісторыі Беларусі: Д.І. Даўгяла, М. Улашчык і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пытанні па матэрыялу лекцыі:

1. Што такое крыніцазнаўства?
2. Што з'яўляецца прадметам вывучэння крыніцазнаўства?
3. Які ўнёсак у распрацоўку тэарэтычных і метадычных пытанняў крыніцазнаўства зрабілі Э.Бернгайм, Ш.-В. Ланглуа і Ш.Сеньобас, В.Дыльтэ, В.Віндэльбанд і Г.Рыкерт, А.С. Лаппо-Данілеўскі?

Літаратура

1. Источниковедение: учебник для академического бакалавриата / Е.Д. Твердюкова и др.; под ред. А.В. Сиренова. – М.: Изд-во Юрайт, 2015. – 296 с.
2. Ходзін С.М. Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі : дапаможнік / С.М. Ходзін. – Мінск: БДУ, 2012. – 255 с.
3. Сиренов А.В. Источниковедение / А.В. Сиренов, Е.Д. Твердюкова, А.И. Филюшкин. – М.: Юрайт, 2015. – 395 с.

**Лекцыя 2. Работа з гістарычнай крыніцай**

Ключавыя паняцці: гістарычная крыніца, знешняя і ўнутраная крытыка крыніц, класіфікацыі гістарычных крыніц

План

1. Азначэнне гістарычнай крыніцы.
2. Праблема класіфікацыі і сістэматызацыі гістарычных крыніц.
3. Асноўныя этапы працы з гістарычнай крыніцай

Канспект лекцыі:

1.Азначэнне гістарычнай крыніцы

Крыніца ўтрымлівае поўную фіксаваную інфармацыю аб рэальным жыцці чалавечага грамадства у мінулым. Чалавек атрымлівае інфармацыю, калі пачынае вывучаць гістарычную крыніцу. Гістарычная крыніца – гэта матэрыяльны аб'ект, які мае сацыяльную прыроду паходжання, змяшчае інфармацыю аб мінулым жыцці людзей і ўключаны ў працэс гістарычнага даследавання.

2. Праблема класіфікацыі і сістэматызацыі гістарычных крыніц.

Класіфікацыя – гэта раскрыццё ўнутрана неабходнай сувязі паміж асобнымі катэгорыямі гістарычных крыніц: тыпамі, родамі і відамі. Класіфікацыя сістэматызуе крыніцу ў зручныя для вывучэння групы і садзейнічае больш глыбокаму яе аналізу. У пачатку вывучэння гістарычныя крыніцы падзяляліся на "рэшткі" і "паданні". У 1970 – 1980-я гг. атрымалі распаўсюджанне класіфікацыі па тыпах, родах і відах. Л. М. Пушкаровым, А. П. Пранштэйнам была прапанавана класіфікацыя па спосабу фіксавання інфармацыі. Тыпалагічная класіфікацыя гістарычных крыніц была прапанавана С. О. Шмітам.

Сістэматызацыя гістарычных крыніц адбываецца ў выніку дзейнасці даследчыка, які бярэ за аснову толькі адну са шматлікіх знешніх прыкмет крыніцы і стварае сістэму, якая адпавядае мэтам і задачам яго даследавання. Прынцып сістэматызацыі можа быць храналагічны, рэгіянальны, этнічны, праблемны, персанальны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Асноўныя этапы працы з гістарычнай крыніцай

Асноўныя этапы работы з гістарычнай крыніцай уключаюць у сябе пошук і выяўленне крыніц, крыніцазнаўчы аналіз (этап навуковай крытыкі), а таксама этап распрацоўкі метадаў вывучэння, апрацоўкі, аналізу інфармацыі крыніц. Крыніцазнаўчы аналіз складаецца з вызначэння знешніх асаблівасцяў крыніцы, устанаўлення сапраўднасці крыніцы, прачытання тэксту крыніцы, устанаўлення месца, часу, мэтаў, абставін і аўтарства тэксту. Потым даецца тлумачэнне (інтэрпрэтацыя) тэксту і робіцца дакладнасці, паўнаты і навуковай значнасці крыніцы.

<u>Пытанні па матэрыялу лекцыі</u>:

1. Што такое гістарычная крыніца?
2. Чым адрозніваецца класіфікацыя крыніц ад іх сістэматызацыі?
3. Якія класіфікацыі крыніц вы ведаеце?
4. Што ўключаюць у сябе асноўныя этапы работы з гістарычнай крыніцай?
5. З чаго складаецца крыніцазнаўчы аналіз?

<u>Літаратура</u>


1. Источниковедение: учебник для академического бакалавриата / Е.Д. Твердюкова и др.; под ред. А.В. Сиренова. – М.: Изд-во Юрайт, 2015. – 296 с.
2. Ходзін С.М. Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі : дапаможнік / С.М. Ходзін. – Мінск: БДУ, 2012. – 255 с.
3. Источниковедение : учебное пособие / Высшая школа экономики, национальный исследовательский университет; [Н.И. Данилевский и др.]; отв. Ред. М.Ф. Румянцева. – М.: Издат. дом Высш. школы экономики, 2015. – 684 с.


## <u>Лекцыя 3.</u> Дакументальныя крыніцы: заканадаўчыя дакументы

<u>Ключавыя паняцці</u>: звычаёвае права, Руская праўда, устаў, ухвала, канстытуцыя, статут, маніфест, дэкрэт.

<u>План</u>

1. Матэрыялы заканадаўства зямель Русі ў IX-XIII стст.
2. Заканадаўства Вялікага княства Літоўскага
3. Заканадаўства Расійскай імперыі
4. Заканадаўчыя дакументы навейшага часу.

<u>Канспект лекцыі:</u>

1.Матэрыялы заканадаўства зямель Русі ў IX-XIII стст.

Найбольш значныя нормы агульнарускага права X ст. («закона рускага») змяшчаюцца ў дагаворах Русі з Візантыяй 911 і 944 гг. «Руская праўда» – першы з дайшоўшых да нас сістэматычных зборнікаў права ўсходнеславянскіх (рускіх) зямель X – XII ст. Гэта звод пастаноў і судовых звычаяў. Яна заснавана на асобных княжацкіх пастановах. у перыяд ранняга сярэднявечча ўсе сферы грамадскага жыцця рэгуляваліся звычаёвым правам. Першыя запісы звычаёвага права Беларусі былі зроблены ў граматах і дагаворах Полацка, Віцебска і Смаленска з Рыгай і Лівонскім ордэнам. Але ўжо з XIV ст. пачынае развівацца заканадаўства, якое паступова абмяжоўвае звычаёвае права.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2.Заканадаўства Вялікага княства Літоўскага

У XII–XV стст. існуе адсутнасць дакладнага размежавання паміж актам і законам, распараджэннем выканаўчай улады, паміж дзяржаўным і прыватным правам вызначае існаванне ў гэты перыяд шмат прамежкавых (пераходных) груп. Адной з іх з'яўляюцца т. зв. устаўныя граматы вялікіх князёў літоўскіх. Па тыпах вылучаюць ільготныя, даравальныя (ці жалаваныя) і ахоўныя (ці пацвярджальныя) граматы, па відах – земскія, абласныя, гарадам ці групам насельніцтва, канкрэтным асобам.

У XV–XVI ст. ўставамі называўся шэраг заканадаўчых дакументаў (канстытуцыі, статуты, сеймавыя ўхвалы). Найбольш вядомая «Устава на валокі» 1557 г. – закон аб правядзенні валочнай памеры ў Вялікім княстве Літоўскім, выдадзены вялікім князем Жыгімонтам II Аўгустам і панамі-радай.

Узмацненне цэнтральнай улады ў XV ст. дазволіла пачаць выпрацоўку кодэксаў права – агульных для ўсёй дзяржавы заканадаўчых нормаў. Першы кодэкс у адным спісе меў назву «Судзебнік». Найбольш буйныя зборы законаў феадальнага права ў княстве атрымалі назву статутаў - першы – у 1529 г., другі – у 1566 г. і трэці – у 1588 г.

Ухваламі да 1569 г. (Люблінскай уніі) называліся пастановы сейма. Канстытуцыі сеймаў Рэчы Паспалітай падзяляліся на тры групы: 1) тыя, што датычыліся ўсёй Рэчы Паспалітай; 2) рашэнні, якія датычыліся толькі Польшчы; 3) рашэнні, якія мелі сілу толькі ў Вялікім княстве Літоўскім. Як правіла, апошнія ў сеймавых дакументах вылучаліся ў спецыяльны раздзел.

3.Заканадаўства Расійскай імперыі

У заканадаўстве, якое дзейнічала на тэрыторыі Беларусі ў перыяд яе знаходжання ў складзе Расійскай імперыі, умоўна можна вызначыць тры перыяды. Першы ўключае ў сябе канец XVIII – 30-я гг. XIX ст. У гэты час на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі не толькі нормы права Расійскай імперыі, але і Статута 1588 г. Другі - 40-я гг. XIX – пачатак XX ст. і трэці перыяд - 1905 – 1917 гг. Класіфікацыя матэрыялаў заканадаўства гэтага часу складаная і ўключае маніфесты, указы, пастановы, палажэнні, інструкцыі, уставы, законы і г. д. маніфесты былі адной з самых распаўсюджаных формаў заканадаўства канца XVIII – пачатку XX ст. Яны выдаваліся ў сувязі з важнейшымі падзеямі ў палітычным жыцці краіны. Другую, больш шматлікую групу заканадаўчых актаў складалі ўказы, якія падзяляліся на тры катэгорыі: а) імянныя; б) абвешчаныя з Сената; в) сенацкія.

Палажэнні яўлялі сабой комплекс узаемазвязаных заканадаўчых дакументаў. Закон, як асобная разнавіднасць заканадаўчых актаў, сустракаўся параўнальна рэдка. Пэўнае значэнне гэтай катэгорыі было нададзена толькі з пачаткам дзейнасці Дзяржаўнай думы. Важнымі разнавіднасцямі заканадаўчых дакументаў з'яўляліся інструкцыі, настаўленні і наказы.

4.Заканадаўчыя дакументы навейшага часу.

У заканадаўстве навейшага часу можна вызначыць наступныя перыяды: 1) 1917 – 1920 гг. – перыяд дзейнасці на тэрыторыі Беларусі кароткачасовых дзяржаўных і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак; 2) 1921 – 1991 гг. –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

заканадаўства БССР (якое з 1939 г. уключала ўсю тэрыторыю рэспублікі); 3) з жніўня–верасня 1991 г. – заканадаўства Рэспублікі Беларусь. Асноўнымі дакументамі гэтага часу з’яўляюцца Дэкрэты і Канстытуцыі.

Пытанні па матэрыялу лекцыі:

Што прадстаўляе сабой “Руская Праўда”?

Дзе фіксуюцца нормы звычаёвага права?

Якія тыпы ўстаўных грамат вылучаюць у XII–XV стст.

Якімі кодэксы прадстаўлены ў ВКЛ нормы заканадаўчага права?

Якія этапы можна вылучыць у часы знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі?

Літаратура


1. Ходзін С.М. Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі : дапаможнік / С.М. Ходзін. – Мінск: БДУ, 2012. – 255 с.
2. Матюшевская М.И. Источниковедение истории Беларуси / М.И. Матюшевская. – Могилев: МГУ, 2010-2011. Ч. 1.: Матюшевская М.И. Материалы законодательства на Беларуси IX–XXI вв. – 2010 г. – 42 с.


## **Лекцыя 4.** Дакументальныя крыніцы: актавыя матэрыялы

Ключавыя паняцці: акт, публічнаправавы акт, прыватнаправавы акт, фармуляр, інвакацыя, інскрыпцыя, салютацыя, дагаворы Русі з Візантыяй, прывілей, грамата, унія.

План

1. Паняцце гістарычнага акта
2. Актавыя матэрыялы X – XIII ст.
3. Актавыя матэрыялы перыяду ВКЛ

Канспект лекцыі:

1. Паняцце гістарычнага акта

Гістарычныя акты – гэта дакументы, у якіх у форме пэўных юрыдычных нормаў зафіксаваны эканамічныя ці палітычныя здзелкі, дагаворы паміж прыватнымі асобамі, прыватнымі асобамі і дзяржавай. Акты падзяляюцца на публічнаправавыя (урадавага паходжання) і прыватнаправавыя (заключаныя паміж прыватнымі асобамі). Кожны асобны акт складаецца з формул – граматычна закончаных сказаў, раздзеленых пры публікацыі кропкай. Уся сума формул акта называецца фармулярам.

Акты маюць тры асноўныя часткі: пачатковы пратакол, дзе ёсць прысвячэнне Богу (інвакацыя), указанне, ад каго зыходзіць акт, ці імёны ўдзельнікаў здзелкі, вызначаюцца асобы, якім адрасуецца дакумент (інскрыпцыя), ёсць прывітанне (салютацыя); асноўную частку, якая ўключае прэамбулу (з аб'яўленнем вышэйшай мэты складання акта), вызначэнне сутнасці справы, забарону пад пагрозай божай кары ці штрафа парушаць распараджэнне (пагадненне), пасведчанне аб замацаванні дакумента подпісам і г. д. і канчатковы пратакол, дзе ёсць формулы аб тым, калі і кім напісаны акт, пазначаны сведкі заключанай здзелкі.

2. Актавыя матэрыялы X – XIII ст.

Да актавых матэрыялаў X – XIII стст. належаць дагаворы Русі з Візантыяй

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

911, 941, 971 гг., тэксты якіх змешчаны ў «Аповесці мінулых гадоў». Да найбольш ранніх рускіх актаў адносяцца царкоўныя ўставы. Самыя старажытныя акты узнікалі пераважна ў сферы грамадска-палітычных і сацыяльна-палітычных адносін.

3. Актавыя матэрыялы перыяду ВКЛ

Актавыя матэрыялы гэтага перыяду прадстаўлены прывілеямі («даравальнымі граматамі»), якія выдаваліся фізічным ці юрыдычным асобам (установам, гарадам, царквам, манастырам), калі за імі замацоўвалася якая-небудзь нерухомая маёмасць. Пацвярджальныя даравальныя граматы мелі спасылку на тое, што яны складаліся на падставе прадстаўленых дакументаў («лістоў»). Часам выдаваліся прывілеі вялікіх князёў літоўскіх, якія вызвалялі тых ці іншых асоб ад юрысдыкцыі звычайнага суда. Да даравальных блізкія ўказныя велікакняжацкія граматы («лісты»). У гэты час існавалі граматы, якія замацоўвалі розныя прыватныя пагадненні (здзелкі) на нерухомую маёмасць. Да іх можна аднесці купчыя (прадажныя) граматы.

Міжкняжацкія дагаворныя граматы маюць істотнае значэнне для вывучэння пачатковага перыяду станаўлення ВКЛ. Вялікі князь «дараваў» землі ўдзельнаму князю ў абмен на прызнанне вярхоўнай улады вялікага князя. Імунітэтныя граматы выдаваліся ад імя князя асобным манастырам. Знешнепалітычныя акты прадстаўлены дагаворнымі граматамі Полацка XIV–XV ст. з Рыгай. Да актавых матэрыялаў таксама належаць уніі.

<u>Пытанні па матэрыялу лекцыі</u>:

1. Якія актавыя матэрыялы з'яўляюцца найбольш старажытнымі?
2. Якімі дакументамі прадстаўлены актавыя матэрыялы ВКЛ?
3. Каму выдаваліся імунітэтныя граматы?

<u>Літаратура</u>


1. Ходзін С.М. Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі : дапаможнік / С.М. Ходзін. – Мінск: БДУ, 2012. – 255 с.
2. Матюшевская М.И. Источниковедение истории Беларуси / М.И. Матюшевская. – Могилев: МГУ, 2010-2011. Ч. 2.: Матюшевская М.И. Актовые материалы, материалы делопроизводства, экономико-географические, хозяйственные и статистические описания. – 2011. – 38 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**<u>Лекцыя 5.</u> Дакументальныя крыніцы: матэрыялы справаводства, статыстычныя і гаспадарчыя апісанні**

<u>Ключавыя паняцці</u>: дакумент, канцылярыя, Літоўская Метрыка, ухвалы, мытныя кнігі, справаздачы губернатараў, уставы, інвентары.

<u>План</u>

1. Паняцце “дакумент”.
2. Матэрыялы справаводства перыяду ВКЛ.
3. Сеймавыя матэрыялы XVI – XVII ст.
4. Мытныя кнігі XIV – XVIII ст.
5. Дакументы справаводства перыяду Расійскай імперыі.
6. Статыстычныя матэрыялы.

1.Паняцце “дакумент”.

Дакумент – гэта матэрыяльны аб’ект з інфармацыяй, замацаванай пэўным спосабам для яе передачы ў часе і прасторы. Афіцыйны дакумент створаны арганізацыяй, установай ці службовай асобай і аформлены ва ўстаноўленым парадку.

Рух дакументаў ва ўстанове ці арганізацыі з моманту іх стварэння ці атрымання да завяршэння выканання ці адпрацоўкі называюць дакументазваротам. Для стварэння дакументаў і працы з імі ва ўстановах звычайна існуюць спецыяльныя аддзелы, якія маюць назву «канцылярыя».

2.Матэрыялы справаводства перыяду ВКЛ.

*Літоўская Метрыка»* – гэта *гістарычная назва архіўных рукапісных кніг велікакняжацкай* (пазней – *агульнадзяржаўнай) канцылярыі* Вялікага княства Літоўскага XV – XVII ст. Кнігі ў вялікакняжацкай канцылярыі складаліся з асобных аркушаў і сшыткаў, на якіх пісаліся дакументы. Вылучаюцца наступныя кнігі. У *«Кнігі данін»* запісваліся дакументы заканадаўчага характару: прывілеі, агульназемскія, абласныя, гарадам, этнічным і канфесійным групам насельніцтва, дакументы на зямельныя ўладанні і на правы, непасрэдна звязаныя з землеўладаннем. *У «Кнігі спраў судовых» запісваліся* «лісты», напісаныя ад імя гаспадара і запісы «пра памяць» – пратаколы разбору справы ці асобны момант гэтай справы. У *«Кнігах арэнд» знаходзяцца* дакументы адносна продажу (гэта значыць аддачы ў арэнду, на водкуп мыт, карчмы. «*Рэестры отправ»* – гэта пералік данін грашыма, харчамі і рэчамі са сродкаў скарбу. *«Кнігі пасольстваў»* змяшчаюць дакументы аб зносінах ВКЛ з іншымі дзяржавамі. Арыгінальныя кнігі Метрыкі за XV–XVI ст. у большасці сваёй загінулі падчас войнаў сярэдзіны XVII ст.

На працягу XVI – XVIII ст. сфарміраваўся ў асноўным *сучасны склад кніг: «Кнігі запісаў», «Кнігі судовых спраў», «Кнігі публічных спраў» і «Кнігі перапісаў».* Найбольшую колькасць матэрыялаў кніг складаюць дакументы, што пацвярджаюць уласнасць феадалаў на нерухомую маёмасць. Найбольш шматлікая група кніг Метрыкі – «*Кнігі судовых спраў»*. Яны ўключалі таксама дакументы Віленскага замкавага суда і рашэнні на справах Брэсцкага і Кобрынскага староставаў. У аддзеле *«Кнігі публічных спраў»* сабраныя кнігі, якія змяшчаюць дакументы агульнадзяржаўнага значэння: сеймавыя і канфедэрацкія рашэнні, пасольствы ў іншыя дзяржавы, граматы і дыпломы на пасады. *«Кнігі перапісаў»* уключаюць люстрацыі, пописы замкаў, староставаў (падрабязнае апісанне межаў з суседнімі дзяржавамі).

3.Сеймавыя матэрыялы XVI – XVII ст.

Вальныя сеймы ў Вялікім княстве Літоўскім пачалі праводзіцца з 1401 г. На іх прымаліся акты уніі з Польскім Каралеўствам і прывілеі. З 1507 г. у якасці пастаноў сейма з’яўляюцца ўхвалы. Пачынаючы з вальнага сейма 1547 г. разам з ухваламі запісваюцца «прозьбы» шляхты ВКЛ і «отказы». Матэрыялы мясцовых сеймікаў – гэта інструкцыі і наказы дэпутатам на вальны (усеагульны) сейм, хадайніцтвы і просьбы да ўрада, а таксама справаздачы паслоў і інфармацыя аб прайшоўшых сеймах. Прыкладам падрабязнай справаздачы аб сейме з’яўляецца «Дзённік Люблінскага сейма 1569 г.», які

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

знаходзяцца на мяжы паміж матэрыяламі справаводства і гісторыка-мемуарнай літаратурай.

4.Мытныя кнігі XIV – XVIII ст.

Мытныя кнігі змяшчаюць звесткі пра суму пошліны і купцоў. Спачатку памер мыту ўстанавліваўся мясцовым звычаем і не быў аднолькавым у розных мясцовасцях. З другой паловы XVI ст. былі выдадзены гаспадарскія ўставы, што вызначалі памеры мытнага збору. Мытныя кнігі Беларусі XIV – сярэдзіны XVI ст. не захаваліся. Мытныя кнігі перыяду Рэчы Паспалітай змяшчаюць інфармацыю аб прозвішчы і месца жыхарства купцоў, якія правозілі тавары праз мяжу; назвы і колькасць тавараў, кірункі іх увозу (вывазу), а таксама суму мытнага збору ў дзяржаўны скарб за ўвоз тавараў з-за мяжы (вываз за мяжу).

Захаваліся мытныя кнігі Брэста за 1583, 1605 гг., Віцебска – за 1605 г., Гродна – за 1600, 1605, 1764 гг., Магілёва – за 1612, 1708 гг., Полацка – за 1616, 1708 гг., Мінска, Барысава – за 1708 г. і г. д. Аналіз звестак мытных кніг дазваляе зрабіць вывады аб развіцці рамёстваў і гандлю ў беларускіх гарадах, іх сувязях з замежжам, а таксама аб асноўных гандлёвых шляхах на тэрыторыі Беларусі.

5.Дакументы справаводства перыяду Расійскай імперыі.

Большасць матэрыялаў справаводства азначанага перыяду – рукапісныя помнікі, для якіх характэрны выразны почырк і ўжыванне спецыфічных канцылярскіх зваротаў, выразаў, тэрмінаў («канцылярская мова»). З матэрыялаў справаводства найбольшую цікавасць прадстаўляюць справаздачы губернатараў, якія пачалі дасылацца ў Пецербург з пачатку XIX ст. Справаздачы змяшчаюць такія раздзелы як натуральныя і вытворчыя сілы губерні: мясцовасць, насельніцтва, дваранства, прамысловасць, гандаль, сельская гаспадарка, падаткі і павіннасці, грамадскі дабрабыт: дарогі, масты, пошты, раскольнікі, беглыя, асобы пад наглядам паліцыі, ахова здароўя, народная асвета, мясцовая адміністрацыя і судавытворчасць.

6.Статыстычныя матэрыялы.

Статыстычныя матэрыялы прадстаўлены такімі крыніцамі як пісцовыя кнігі гаспадарскія, рэвізіі, інвентары. Велікакняжацкая гаспадарчая палітыка выявілася ў т. зв. «устаўных граматах» («уставах»). «Устава на валокі 1557 г.» паклала пачатак правядзенню аграрнай рэформы («валочнай памеры»).

З пачатку XVII ст. ужываецца тэрмін «інвентары», якія падзяляюць па аб'ёму ахопленай тэрыторыі (інвентары княстваў, фальваркаў, вёсак, маёнткаў) і па аб'ёму звестак («поўныя» і «кароткія»).

<u>Пытанні па матэрыялу лекцыі</u>:

Як называюцца архіўныя кнігі канцылярыі ВКЛ?

Што змяшчаюць матэрыялы мясцовых сеймікаў?

Якія бакі жыцця асвятлялі справаздачы губернатараў?

Якімі крыніцамі прадстаўлены статыстычныя матэрыялы?

<u>Літаратура</u>

1. Ходзін С.М. Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі : дапаможнік / С.М. Ходзін. – Мінск: БДУ, 2012. – 255 с.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

2. Матюшевская М.И. Источниковедение истории Беларуси / М.И. Матюшевская. – Могилев: МГУ, 2010-2011. Ч. 2.: Матюшевская М.И. Актовые материалы, материалы делопроизводства, экономико-географические, хозяйственные и статистические описания. – 2011. – 38 с.

**Лекцыя 6. Апавядальныя крыніцы: летапісы і хронікі**

Ключавыя паняцці: летапіс, ізвод, хроніка, “Аповесць мінулых гадоў”.

План

1. Летапісанне на Беларусі
2. Хронікі як крыніцы па гісторыі Беларусі.

1.Летапісанне на Беларусі

Летапіс – гэта гістарычнае апавяданне, у якім звесткі размяшчаюцца пад пэўнымі гадамі. Першыя летапісы не захаваліся да нашага часу. Спіс тэксту з недакладнасцямі і скажэннямі мае назву ізвод.

Зараджэнне летапісу як жанру на Беларусі адбылося ў XII–XIV ст., аднак летапісы гэтага часу не захаваліся. Больш-менш дакладным з’яўляецца існаванне Полацкага летапісу. У гэты час існавала мясцовае летапісанне.

Росквіт летапісання прыходзіўся на XV–XVI стст., яго асноўнай рысай з’яўляецца агульнадзяржаўны характар. Адсюль паходзіць назва – «літоўска-рускія летапісы». Беларускія летапісы і хронікі захаваліся ў 22 спісах. Існуюць тры асобныя летапісныя зводы: I, II, III, адпаведна — «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх», «Хроніка вялікага княства літоўскага» і «Хроніка Быхаўца».

Заняпад адбыўся ў XVII – пачатку XIX ст., калі губляецца агульнадзяржаўны характар летапісаў, на першы план выходзяць мясцовыя падзеі і жанр летапісання спалучаецца з мемуарнай літаратурай (Баркалабаўскі летапіс), або замяняецца гістарычным даследаваннем элементарна-крытычнага характару («Хроніка Польская, Літоўская, Жамойцкая і ўсёй Русі» Мацея Стрыйкоўскага). У гэты час існуюць гарадскія хронікі. Найбольш вядомыя з іх - «Магілёўская хроніка» Т. Сурты і Трубніцкіх, «Запіскі ігумена Арэста» і «Хроніка Віцебска”.

Для вывучэння гісторыі Беларусі каштоўнай крыніцай з’яўляецца “Аповесць мінулых гадоў”, дзе змяшчаюцца звесткі пра рассяленне славянскіх плямёнаў, беларускія гарады Полацк, Віцебск, Мінск, Тураў, Пінск, Брэст, Друцк, першапачатковая гісторыі Полацкага княства.

2.Хронікі як крыніцы па гісторыі Беларусі.

Крыніцамі па гісторыі Беларусі з’яўляюцца таксама хронікі: «Хроніка Гала Аноніма», «Хроніка магістра Вінцэнта Кадлубка», «Хроніка Лівоніі», напісаная каталіцкім святаром Генрыхам Латвійскім, дзе можна знайсці звесткі пра гарады-фарпосты Полацкага княства на Дзвіне (Кукейнас і Герцыке), пра іх князёў Вячку і Усевалада, пра сумесную барацьбу ліваў, эстаў, літвы і палачан супраць крыжацкай агрэсіі.

Пытанні па матэрыялу лекцыі:

1. Што такое летапіс?
2. Якія этапы летапісання на тэрыторыі Беларусі вы ведаеце? Што для іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

характэрна?
3. Якія хронікі маюць звесткі па гісторыі Беларусі?

Літаратура


1. Ходзін С.М. Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі : дапаможнік / С.М. Ходзін. – Мінск: БДУ, 2012. – 255 с.
2. Матюшевская М.И. Источниковедение истории Беларуси / М.И. Матюшевская. – Могилев: МГУ, 2010-2011. Ч. 3.: Матюшевская М.И. Летописи и хроники, литературные и публицистические произведения, мемуарная литература, эпистолярные источники и периодическая печать. – 2011. – 57 с.


**Лекцыя 7. Апавядальныя крыніцы: мемуарная літаратура**

Ключавыя паняцці: мемуары, успаміны, запіскі падарожнікаў

План

1. Віды мемуарнай літаратуры
2. Этапы развіцця мемуарнай літаратуры на Беларусі.

1.Віды мемуарнай літаратуры

У цэнтры мемуарнай літаратуры знаходзіцца асоба аўтара, таму грамадскія падзеі ў іх паказаны праз яе суб'ектыўнае ўспрыманне. Успаміны пішуцца самім мемуарыстам, у іх аўтар праз нейкі час пасля пэўных падзей расказвае аб іх ці аб усім сваім мінулым жыцці. Часам мемуарыст звяртаецца да дапамогі літаратара і апошні надае ўспамінам літаратурную форму. Такая форма называецца літаратурным запісам успамінаў. Па ініцыятыве архіваў, інстытутаў, камісій і музеяў, якія зацікаўлены ў зборы і захаванні мемуарных крыніц ствараюцца стэнаграфічныя (пратакольныя) запісу ўспамінаў. Дзённікі ўзнікаюць тады, калі сучаснік апавядае аб падзеях, людзях, пачуццях дзень за днём на працягу ўсяго свайго жыцця або нейкага яго перыяду. Некаторыя даследчыкі ўключаюць у склад дзеннікаў запіскі падарожнікаў, якія з'яўляюцца гісторыка-літаратурнымі апавяданнямі, але маюць рысы дзённіка. Літаратуры падарожжаў заўсёды належала істотная роля ў працэсе знаёмства розных народаў. Запіскі падарожнікаў змяшчаюць свежы погляд прадстаўніка іншай культуры, іншых традыцый і каштоўнасцей.

2.Этапы развіцця мемуарнай літаратура на Беларусі.

На першым этапе, у другой палове XVI ст., дзеннікі маюць рысы летапісаў, таму што аддаюць перавагу сюжэту апавядання, мясцовым падзеям, гісторыі жыцця асобных сем'яў ці дзеячаў. Прыкладам мемуарнай літаратуры гэтага перыяду з'яўляюцца «Дзённікі паходаў Стэфана Баторыя». Характэрная рыса развіцця мемуарнага жанру другой паловы XVI – XVII ст. – пільная ўвага да грамадскіх падзей у краіне.

Другі этап супадае з XVIII ст. Цяпер у дзённіках і ўспамінах з'яўляецца суб'ектыўнае «я» аўтара, адлюстроўваюцца яго думкі і пачуцці (эгацэнтрычнасць). Часам мемуарыстыка набліжаецца да мастацкай прозы – прыгодніцкага рамана (І. Турчыноўскі, С. П. Пільштынова), сентыментальнай аповесці-споведзі (Ф. Карпінскі). Трэці этап акрэсліваецца на пачатку XIX ст. і ахоплівае перыяд прыкладна да 1920-х гг. Ён характарызуецца павелічэннем

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

колькасці твораў мемуарнай літаратуры, узрастаннем палітызаванасці, пашырэннем кола аўтараў, сярод якіх – значная колькасць разначынцаў: чыноўнікаў, служачых, інтэлігентаў, а крыху пазней – купецтва, сялян і рабочых. У іх творах адлюстроўваюцца розныя бакі тагачаснага жыцця. Мемуары чацвёртага этапу вызначаюцца ў якасці зброі ідэалагічнай і палітычнай барацьбы, яны пачынаюць з'яўляцца з пачатку ўстанаўлення Савецкай улады на тэрыторыі Беларусі. Мемуарысты таго часу прыходзяць да разумення тыповасці сваёй індывідуальнасці, дэманструюць непарыўнасць свайго лёсу з лёсам краіны, народа. Новым штуршком развіцця мемуарнай літаратуры стала барацьба з фашызмам у 1941 – 1945 гг. Узрастае колькасць мемуараў, а таксама з'яўляюцца новыя іх разнавіднасці: успаміны-анкеты, стэнаграфічныя і літаратурныя запісы ўспамінаў. З пачатку 1960-х гг. з'яўляюцца таксама ўспаміны дзеячаў культуры (З. Азгура, П. Мядзёлкі, А. Карпюка). Пяты этап пачаўся з канца 1980-х гг., ён, у прыватнасці, характарызуецца публікацыяй такіх твораў, як успаміны рэпрэсіраваных, дзеячаў беларускай эміграцыі.

Пытанні па матэрыялу лекцыі:

1. Якія віды мемуарнай літаратуры вы ведаеце?
2. Што характэрна для мемуарнай літаратуры XVIII стст.?
3. Чаму запіскі падарожнікаў можна выкарыстоўваць у якісці гістарычнай крыніцы?

Літаратура


1. Ходзін С.М. Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі : дапаможнік / С.М. Ходзін. – Мінск: БДУ, 2012. – 255 с.
2. Матюшевская М.И. Источниковедение истории Беларуси / М.И. Матюшевская. – Могилев: МГУ, 2010-2011. Ч. 3.: Матюшевская М.И. Летописи и хроники, литературные и публицистические произведения, мемуарная литература, эпистолярные источники и периодическая печать. – 2011. – 57 с.


**Лекцыя 8. Апавядальныя крыніцы: літаратурныя, агіяграфічныя і публіцыстычныя творы**

Ключавыя паняцці: жыціе, публіцыстычныя творы, царкоўна-палемічная публіцыстыка, літаратурныя творы.

План

1. Агіяграфічныя творы
2. Літаратурныя творы
3. Публіцыстычныя творы

1.Агіяграфічныя творы

Агіяграфічныя творы - гэта культурнае запазычанне з Візантыі, узятае разам з хрысціянствам. Для гэтых твораў характэрна пэўны прагматызм і схематычнасць. Вобразы персанажаў усё больш пазбаўляюцца індывідуальнасці, ідэалізуюцца, мадэлююцца з вядомага набору станоўчых якасцей, аддаляюцца ад рэальнасці. Складваюцца пэўныя схемы, якіх імкнуцца прытрымліваюцца складальнікі гэтага віду гісторыка-літаратурных твораў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Большасць жыцій складаецца з рытарычнага ўступу, апавядання пра жыццё святога і заканчваецца пахвалой святому, параўнаннем героя са старадаўнімі святымі, просьбай маліцца за тых, хто шануе ягоную памяць, а таксама рытарычныя заклікі да святога, яго бацькоў і яго роднага горада. Згодна тэзісам В. В. Ключэўскага, жыціе можна разглядаць як гістарычную крыніцу, аднак трэба улічваць наступныя рысы: біяграфічныя факты з'яўляюцца толькі пэўнымі формамі для выяўлення ідэальнага вобразу святога; з жыцця «жыціе» бярэ толькі такія рысы, якія вядуць да вызначанай задачы; выбраныя рысы абагульняюцца ў жыціі настолькі, каб індывідуальная асоба знікла ў іх за рысамі ідэальнага плана; агіябіёграф шукае ў асобе святога адлюстраванне ідэалу, гісторык - індывідуальныя гістарычныя рысы; колькасць і якасць біяграфічных фактаў у жыціі адваротна прапарцыянальныя ўрачыстасці прычыны стварэння жыція і храналагічнай адлегласці, якая ляжыць паміж смерцю святога і напісаннем жыція. Прыкладам жыційнай літаратуры з'яўляецца "Жыціе Еўфрасінні Полацкай".

2.Літаратурныя творы

Літаратурныя творы XI-XIII стст. адметны сваёй публіцыстычнай накіраванасцю. Прыкладам таго з'яўляецца творчасць Кірылы Тураўскага. Да нас дайшло больш за 40 яго твораў: казанні, павучанні на тэмы Евангелля, пісанняў пракаў, малітвы і канон аб пакаянні, аповесці. Цікавай крыніцай перыяду XI – XIII ст. з'яўляецца «Слова аб палку Ігаравым», гэты помнік літаратуры XII ст. можна вызначыць як найцікавейшую крыніцу па палітычнай гісторыі Беларусі XI – XII ст.

У XVI–XVIII стст. мастацкая літаратура па-ранейшаму грунтуецца на гістарычным матэрыяле. Так, у цэнтры апісання гісторыка-эпічнай паэмы Яна Вісліцкага «Пруская вайна» (1516) знаходзіцца знакамітая бітва 15 ліпеня 1410 г. Па-ранейшаму літаратурны твор лічыўся творам выхаваўчым, значная частка мастацкіх твораў мела павучальны змест (Сімяон Полацкі). Сінтэзам гістарычнага апавядання і публіцыстыкі з'явілася паэма Мікалая Гусоўскага «Песня пра зубра». Каштоўнай гістарычнай крыніцай з'яўляецца літаратурна-публіцыстычная спадчына Францыска Скарыны, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, якая адлюстравала іх грамадска-палітычныя, філасофскія, прававыя, эстэтычныя і педагагічныя погляды і дазволіла нам вывучаць характэрныя рысы грамадскай думкі Беларусі XVI ст. Каштоўным пластом літаратурна-публіцыстычных твораў XVI – XVIII ст. стала палемічная літаратура: свецкая і рэлігійная. Царкоўна-палемічная публіцыстыка гэтага часу звязана з барацьбой дзвюх хрысціянскіх канфесій у Вялікім княстве Літоўскім, са стварэннем і дзейнасцю уніяцкай царквы (Пётр Скарга, Андрэй Волан, Лявонцій Карповіч, браты Зізаніі, Мялецій Сматрыцкі).

3.Публіцыстычныя творы

Публіцыстычныя творы XIX-XX стст. характэрызуюцца ўзнікненнем літаратурна-мастацкай, навуковай і грамадска-палітычнай публіцыстыкі. Вызначаюцца афіцыйная, праўрадавая і апазіцыйная публіцыстыка. У публіцыстыцы XIX ст. вызначаюцца кансерватыўны, ліберальны, дэмакратычны і рэвалюцыйна-радыкальны напрамкі, асобна вызначаецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

публіцыстыка царквы. На пачатку XX ст. публіцыстыка становіцца адной з формаў партыйнай прапаганды; публіцыстычную накіраванасць набываюць нават праграмныя дакументы розных партый.

Пытанні па матэрыялу лекцыі:

1. Якія часткі ўключае ў сябе жыціе?
2. Якія тэзісы В.В. Ключэўскага дапамагаюць у вывучэнні жыція як гістарычнай крыніцы?
3. Якая рыса характэрна для ранніх літаратурных твораў?
4. Якія віды публіцыстыкі XIX-XX стст. вы ведаеце?

Літаратура


1. Ходзін С.М. Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі : дапаможнік / С.М. Ходзін. – Мінск: БДУ, 2012. – 255 с.
2. Матюшевская М.И. Источниковедение истории Беларуси / М.И. Матюшевская. – Могилев: МГУ, 2010-2011. Ч. 3 : Матюшевская М.И. Летописи и хроники, литературные и публицистические произведения, мемуарная литература, эпистолярные источники и периодическая печать. – 2011. – 57 с.


**Лекцыя 9. Апавядальныя крыніцы: эпісталярныя крыніцы і перыядычны друк**

Ключавыя паняцці: пісьмы, запіскі, пасланні, газеты,

План

1. Эпісталярныя крыніцы.
2. Перыядычны друк

Эпісталярныя крыніцы.

Важную групу або катэгорыю гісторыка-літаратурных крыніц складае эпісталярная спадчына — пісьмы, запіскі, пасланні. Пісьмы маглі быць накіраваны ў перыядычныя выданні, установы, пісьмы палітычным, грамадскім дзеячам, вучоным, прадстаўнікам мастацтва. Прыватная перапіска прадстаўлена прыватным пісьмом – гэта пісьмовым асабістым зваротам аўтара да пэўнай асобы (ці некалькіх асоб). У Вялікім княстве перапіска пашыраецца ў XVI ст. У другой палове XVI ст. пісьмы складана адрозніць ад іншых відаў апавядальных крыніц. У форме пісьмаў складаюцца дзённікі (Я.Збароўскі), эпісталярная форма служыць для выяўлення сваіх думак, поглядаў, і вельмі складана размежаваць прыватную і афіцыйную перапіску (пісьмы аршанскага старасты Ф. Кміты-Чарнабыльскага). У XVIII ст., і асабліва ў XIX ст. колькасць пісьмаў істотна павялічваецца. Пісьмо можа выкарыстоўвацца гісторыкамі ў самых розных планах: гісторыя нашага кнігадрукавання, чытацкага попыту, тэатра і г. д.

Калі разглядаць матэрыялы прыватнай перапіскі, то на працягу XX ст. значэнне гэтага жанру паступова змяншаецца. У параўнанні з XIX ст. пісьмы становяцца не толькі лаканічнымі, але і менш эмацянальна насычанымі. У пасляваенны перыяд паўплывала і развіццё сродкаў сувязі, найперш тэлефанізацыя гарадоў і вёсак Беларусі. З 1980-х гг. адчуваецца паступовае ўздзеянне распаўсюджвання лакальнай камп'ютэрнай сеткі Інтэрнет

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і электроннай пошты, што істотна відазмяніла характар і формы эпісталярнага жанру.

У матэрыялах перапіскі вельмі шмат агульнага з дзённікамі. Пісьмы пераважна складаюцца ў ходзе саміх падзей. Яны таксама заснаваны на памяці і пішуцца найчасцей у ходзе саміх падзей. Разам з тым матэрыялы перапіскі – па сваіх разнавіднасцях, жанрах – крыніцы больш складаныя і разнастайныя, чым дзённікі. Эпісталярная літаратура мяжуе і з многімі іншымі відамі крыніц.

2.Перыядычны друк

Перыядычны друк – комплексная крыніца, якая аб'ядноўвае і традыцыйныя віды крыніц, і разнастайныя спецыфічныя жанры. Тут друкуюцца заканадаўчыя, справаводчыя, статыстычныя дакументы, мемуары, літаратурныя творы. Матэрыялы друку падзяляюць на інфармацыйныя, аналітычныя і мастацка-публіцыстычныя. Інфармацыйныя матэрыялы імкнуцца хутка і дакладна перадаць звесткі аб падзеі, факце, што можа прыводзіць да публікацыі недакладнай інфармацыі. Аналітычныя матэрыялы: агляды, карэспандэнцыі, рэцэнзіі, артыкулы перадаюць не столькі інфармацыю, колькі аўтарскі роздум наконт іх. Мастацка-публіцыстычныя матэрыялы (нарыс, фельетон, памфлет) даюць надзейную ацэнку, якая спалучае грамадска-палітычнае і эмацыянальнае гучанне. Тут прысутнічаюць і дакументалізм, і літаратурны вымысел.

Першым перыядычным выданнем на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь была «Gazeta Grodieńska» («Газета Гродзеньска»), што друкавалася на польскай мове ў Гродна з 1776 па 1780 г. «Віленскую літаратурную газету» («Gazeta literacka Wileńska»), заснаваную ў 1760 г. Віленскай езуіцкай акадэміяй. Апошняя з 1796 г. выходзіла пад назвай «Кур’ер літоўскі» («Kurier Litewski»). Газеты выходзілі штотыдзень невялікімі тыражамі. 30 – 80-я гг. XIX ст.) характарызуюцца станаўленнем і ўмацаваннем расійскага афіцыйнага друку на Беларусі. У 1830-я гг. афармляецца газета «Губернские ведомости». Пасля асэнсавання станоўчага вопыту яе выдання ў буйнейшых гарадах Расіі, указам 1837 г. было пастаноўлена выдаваць ведамасці ва ўсіх губернях. З 1838 г. на рускай мове выходзілі «Виленские губернские ведомости», «Витебские губернские ведомости», «Минские губернские ведомости», «Могилевские губернские ведомости». Ведамасці мелі афіцыйную і неафіцыйную часткі. На мяжы 1850 – 1860-х гг. былі зроблены захады па выданні прыватнай, неафіцыйнай газеты, але закончыліся няўдачай. У 1906 г. выйшла некалькі нумароў «Нашай Долі», традыцыі якой прадоўжыла «Наша Ніва» – штодзённая газета на беларускай мове, якая выдавалася з 1906 па 1915 г. кірыліцай і лацінкай. Яна склала цэлую эпоху ў развіцці беларускага нацыянальнага адраджэння. Перыяд партыйнай манаполіі на друк, які можна падзяліць на 2 этапы: 1917 (1918) – першая палова 1950-х гг. Гэта этап усталявання і ўмацавання бальшавіцкай манаполіі на друк. Другі этап - другая палова 1950-х – 1980-я гг. характарызуецца паступовым пацяпленнем грамадскага клімату. Асаблівасць гэтага перыяду не ў меншай, а ў большай ступені вызначае з'яўленне канкурэнта прэсы – тэлебачання.

<u>Пытанні па матэрыялу лекцыі</u>:

1. Якія рысы характэрны для эпісталярнага жанру другой паловы XVI ст.?

РЭПОЗІТОРЫЙ БДПУ

2. Якое выданне было першым перыядычным выданнем на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь?
3. З якіх частак складаліся “Ведамасці” у XIX ст.?

<u>Літаратура</u>

1. Ходзін С.М. Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі : дапаможнік / С.М. Ходзін. – Мінск: БДУ, 2012. – 255 с.
2. Матюшевская М.И. Источниковедение истории Беларуси / М.И. Матюшевская. – Могилев: МГУ, 2010-2011. Ч. 3.: Матюшевская М.И. Летописи и хроники, литературные и публицистические произведения, мемуарная литература, эпистолярные источники и периодическая печать. – 2011. – 57 с.

**Лекцыя 10. Асноўныя захавальнікі і публікацыі крыніц па гісторыі Беларусі**

<u>Ключавыя паняцці</u>: фонды архіваў і музеяў, вопіс, адзінка захоўвання, Археаграфічная камісія.

<u>План</u>

1. Дзяржаўныя архівы Беларусі і іх фонды. Музеі. Аддзелы рукапісаў і стараддрукаў дзяржаўных бібліятэк.
2. Публікацыі крыніц па гісторыі Беларусі

<u>Канспект лекцыі:</u>

1.Дзяржаўныя архівы Беларусі і іх фонды Дзяржаўныя музеі.

Крыніцы па гісторыі Беларусі захоўваюцца ў фондах дзяржаўных архіваў Беларусі. У рэспубліцы дзейнічаюць каля трох дзесяткаў дзяржаўных архіваў у якіх захоўваецца 12 мільёнаў адзінак захоўвання (спраў). Архівы падзяляюцца на галоўныя, абласныя і ведамасныя. Адным з буйнейшых сховішчаў старажытных крыніц з'яўляецца Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. Тут захоўваюцца больш за мільён дакументаў XIV – пачатку XX ст. Найбольш даўнія ў архіве – пергаментныя даравальныя граматы на валоданне маёнткамі XIV – XVI ст., прывілеі і граматы князёў і каралёў, напісаныя на старабеларускай, польскай і лацінскай мовах, актавыя кнігі судовых устаноў, ратуш, магістратаў XV – XVIII ст. Гістарычныя крыніцы знаходзяцца таксама ў фондах дзяржаўных і ведамасных музеяў, аддзелах рукапісаў і старадрукаў дзяржаўных бібліятэк, Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, Навуковай бібліятэкі НАН Рэспублікі Беларусь. Вялікая колькасць гістарычных крыніц знаходзіцца ў архівах, музеях і бібліятэках Расіі, Літвы, Польшчы, Украіны і іншых дзяржаў.

